Весці БДПУ. Серыя 2. 2020. № 2. С. 24–27

УДК 930.1(476)»1921/39»

# ПРАМЫСЛОВАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ 1921–1939 гг. У АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ 20-х – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 50-х гг. ХХ ст.

**А. А. Савіч,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі славянскіх народаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*

Паступіў у рэдакцыю 01.04.20

UDC 930.1(476)»1921/39»

# INDUSTRIAL PRODUCTION OF WESTERN BELARUS IN 1921–1939 IN DOMESTIC HISTORIOGRAPHY OF THE 20S – THE FIRST HALF OF 50S OF THE XX CENTURY

**A. Savich,**
*PhD in History, Associate Professor of the Department of History of Slavic Nations, Brest State University named after A. Pushkin*

Received on 01.04.20.

Артыкул прысвечаны аналізу працэсу станаўлення і развіцця айчыннай гістарыяграфіі прамысловай вытворчасці Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. у 20-х – першай палове 50-х гг. ХХ ст., выяўляе яе ідэйна-палітычныя, арганізацыйна-метадалагічныя, крыніцазнаўчыя і тэматычна-сюжэтныя прыярытэты. Зараджэнне і развіццё праблематыкі адбывалася ва ўмовах актывізацыі ў БССР ідэйна-прапагандысцкай кампаніі супраць акупацыйна-паланізацыйнай палітыкі Польшчы ў Заходняй Беларусі і зацікаўленасці прамыслова-вытворчай сферай краю з боку савецкіх ваенных і дзяржаўна-палітычных інстанцый, што абумовіла як тэндэнцыйнасць і заідэалагізаванасць публікацый, так і значную ступень аб'ектыўнасці даследаванняў для абмежаванага карыстання.

*Ключавыя словы:* Заходняя Беларусь, прамысловасць, рамяство, галіны вытворчасці, гістарыяграфія, крыніцы, метадалогія.

The article is devoted to the analysis of the process of formation and development of domestic historiography of industrial production of Western Belarus in 1921-1939 in the 20s – the first half of 50s of the XX century, reveals it idea-political, organization-methodological, source-studying and thematical-plot priorities. Formation and development of the problematics was taking place in the conditions of activation in BSSR of idea-propagating campaign against occupational-polonizing policy of Poland in Western Belarus and interest in industrial-production sphere of the land from the side of Soviet military and state-political agencies, which conditioned bias and ideologization of publications as well as significant stage of objectiveness of research for limited usage.

*Keywords:* Western Belarus, industry, craft, branches of production, historiography, sources, methodology.

*Уводзіны.* Запатрабаванасць багатага вопыту прамыслова-рамеснай сферы Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. і адсутнасць апублікаванага манаграфічнага даследавання па тэме актуалізуе яе гістарыяграфічнае асэнсаванне з выяўленнем асноватворных паказчыкаў навукова-даследчыцкага працэсу і адлюстраваннем спецыфікі і ўзроўню яе падачы на розных этапах айчыннай гістарыяграфіі. Запатрабаванасць дадзенага даследавання вынікае з адсутнасці прадметных публікацый па заяўленай тэматыцы, за выключэннем некаторых прац, у якіх станаўленне і развіццё айчыннай гістарыяграфіі прамысловасці і рамяства Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. у 20-х – першай палове 50-х гг. ХХ ст. пададзена пераважна ў бібліяграфічным рэчышчы [1, с. 7–9; 2; 3].

*Асноўная частка.* Пытанні сацыяльна-эканамічнага становішча беларускага народа ў складзе Польшчы ў 1920–1930-я гг., у першую чаргу прамысловасці, у адпаведнасці з патрабаваннямі марксісцка-ленінскай метадалогіі адносіліся да ліку прыярытэтных напрамкаў даследавання Заходняй Беларусі, атрымлівалі ў БССР прадметнае асэнсаванне ў спецыялізаваных навуковых установах, у першую чаргу ў Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі Інбелкульта і Заходнім сектары Інстытута гісторыі партыі пры КПБ. Іх дзейнасць была абумоўлена патрэбамі савецкіх ваенна-палітычных структур, якія займаліся распрацоўкай планаў магчымага польска-савецкага ваеннага канфлікту, вынікі ваеннага аналізу гаспадарча-эканамічнага жыцця Польшчы і Заходняй Беларусі не маглі быць апублікаваны ў адкрытым друку. Асвятленне тэмы ў савецкіх выданнях адбывалася з выразным агітацыйна-прапагандысцкім ухілам і акцэнтацыяй на нацыянальным, сацыяльна-эканамічным уціску з боку польскіх уладаў, палітыка-прававым бяспраўі беларускага народа ў Польшчы, сцвярджэннем адсталасці, каланіяльным, аграрна-сыравінным характары эканомікі, заняпадзе прамысловасці Заходняй Беларусі на фоне поспехаў сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР [4, с. 14–25].

Шматлікія публікацыі ў БССР 1920-х гг. не адлюстроўвалі сапраўднага стану прамысловага развіцця Заходняй Беларусі. У жаданні ўзмацніць адчуванне абумоўленасці чаканага рэвалюцыйнага паўстання цяжкім станам гаспадаркі і жыцця насельніцтва, паводле выданняў памножаным на акупацыйна-дэструктыўную эканамічную палітыку правячых колаў Польшчы, савецкія аўтары захапляліся агучваннем адпаведных ідэалагічна вывераных лозунгаў аб знішчэнні прамысловасці ў Заходняй Беларусі. Важнай рысай публікацый стала нівеляванне характэрнай асаблівасці заходнебеларускай эканомікі, звязанай з вялікім працэнтам рамеснай і дробнарамеснай вытворчасці ў агульнай структуры прамысловасці краю, паказ якой суправаджаўся акцэнтацыяй на адмоўныя паказчыкі, у тым ліку і аб'ектыўныя, выкліканыя, напрыклад, наступствамі разбурэнняў Першай сусветнай вайны, стратай вялікага расійскага рынка збыту [5, с. 9; 6, с. 7]. Ідэйна-палітычныя рэаліі БССР другой паловы 1920-х гг. дазвалялі гаварыць пра рынкавыя паказчыкі прамысловага стану, аўтары разважалі пра заняпад прамысловасці з-за збяднення асноўнай масы сялянства ў выніку цяжкага эканамічнага ўціску ўрада, звужэння рынку для прамысловых тавараў з-за вялікіх падаткаў

і беззямелля, што дапаўнялася адрывам Заходняй Беларусі ад усёй Беларусі і стратай заходнебеларускай прамысловасцю яе натуральных рынкаў. Для ўзмацнення адчування класавай варожасці польскай улады сцвярджалася, што польскія капіталісты і памешчыкі не клапаціліся пра аднаўленне заходнебеларускай прамысловасці, бо хацелі пераўтварыць «крэсы» ў сваю аграрную калонію як рынку для прамысловасці карэннай Польшчы, мясцовыя ж сыравінныя рэсурсы распрадаваліся за межы, не выкарыстоўваючыся для развіцця мясцовай прамысловасці. Асноўным націскным акцэнтам праблематыкі было падкрэсліванне цяжкіх умоў жыцця і працы рабочых, нізкіх заробкаў, наяўнасць вялікіх штрафаў, адсутнасць сістэмы аховы працы і сацыяльнай абароны.

Пры гэтым ужо ў сярэдзіне 1920-х гг. для савецкіх дзяржаўна-палітычных і ваенных структур гісторыкі падрыхтавалі даследаванні з інфармацыяй для «ўнутранага карыстання», якая не агучвалася на старонках выданняў, была засакрэчанай, бо, акрамя іншага, разбурыла б створаныя для ўкаранення патрэбных ідэалагемаў вобразы заходнебеларускай рэчаіснасці. Даследаванні стратэгічна важных пытанняў сацыяльна-эканамічнага становішча Заходняй Беларусі, у першую чаргу стану прамысловасці, а таксама прыроды і насельніцтва, сельскай гаспадаркі, камунікацый, мелі грунтоўную фактаграфічную базу. Гэта тлумачыцца тым, што дадзенага роду інфармацыя мела асаблівую актуальнасць у сувязі з падрыхтоўкай СССР да ваеннага канфлікту з Польшчай. Прамое сведчанне гэтаму знаходзім у даведніку па Заходняй Беларусі, падрыхтаванаму ў 1928 г. да I з'езда КПЗБ [7, арк. 7, 29]. Яго аўтар дзяліў «даследуемы раён» на дзве часткі: Беластоцкае ваяводства з даволі развітай воўнаперапрацоўчай прамысловасцю Беластока і Віленскае і Навагрудскае ваяводствы, дзе прамысловасць «развіта вельмі слаба». Палескае ваяводства нават не ўлічвалася, відавочна, па прычыне незацікаўленасці ваенных заказчыкаў даследавання з-за нязручнасці выкарыстання яго як напрамку ажыццяўлення ваенных аперацый. Даследаванне выяўляе значнасць рэгіёна ў агульнапольскім маштабе, прэзентуючы колькасныя паказчыкі заводаў і рабочых на іх. Уяўляе цікавасць зводная табліца па стане на 1 кастрычніка 1923 г., паводле якой у трох ваяводствах функцыянавалі прадпрыемствы тэкстыльнай і харчовай прамысловасці, металаапрацоўкі, апрацоўкі жывёльнай прадукцыі, папяровая, паліграфічная, дрэваапрацоўчая, мінеральная, будаўнічых матэрыялаў і хімічная. Найбольш прадпрыемстваў мела тэкстыльная – 81 з 5289 рабочымі, прычым з іх толькі 1 і 34 адпаведна прыпадала на Віленскае ваяводства, астатнія на Беластоцкае, у якім была хімічная прамысловасць з 5 прадпрыемствамі і 774 рабочымі. Больш раўнамерна была прадстаўлена дрэваапрацоўка (Віленскае – 25 прадпрыемстваў і 2816 рабочых, Навагрудскае – 18 і 597, Віленскае – 13 і 791 адпаведна) і харчовая прамысловасць (13 і 1523, 9 і 461, 8 і 536 адпаведна). Пры гэтым крыніца выяўляе рамёствы і дробныя промыслы (да 16 работнікаў) і колькасць занятых на іх, адпаведна, Беластоцкае 15 918 і 31 284, Навагрудскае і Віленскае зведзены ў адзіныя паказчыкі – 13 609 і 26 747. Ілюстрацыяй прафесійнай структуры гарадскога насельніцтва з'яўляецца прадстаўленая статыстыка гарадоў Навагрудскага ваяводства, у якіх рабочых 21,6 %, служачых – 10,4 %, «самастойных прадпрымальнікаў» – 68 % [7, арк. 39, 55]. Адзначым тут выяўленую рэлятыўнасць інфармацыі аўтара, які карыстаўся рознымі крыніцамі, у тым ліку і адраснымі кнігамі, імкнучыся дасягнуць дакладнасці на бягучы момант, але ўжо па іншых крытэрыях, у прыватнасці па прадпрыемствах з колькасцю больш за 20 работнікаў, якіх на 1926 г. у Беластоцкім ваяводстве было 152, Навагрудскім – 10, Віленскім – 19 [7, арк. 42–47]. Выкарыстаны матэрыял дазволіў прыйсці да дастаткова аб'ектыўнай высновы, што ў прамысловых адносінах даследуемы раён не з'яўляўся «жыццёва важным цэнтрам» краіны і страта яго ў выпадку вайны з Польшчай не будзе грунтоўным падрывам яе эканамічнай магутнасці [7, арк. 42].

На фоне выяўленай палітычнай індэферэнтнасці да колькасных паказчыкаў прыцягвае ўвагу пазіцыя М. Будзінскага, абумоўленая класава-палітычным светапоглядам аўтара. Вядомы як актыўны праціўнік «беларускага буржуазнага нацыяналізму», напэўна, жадаючы зменшыць пралетарскую праслойку насельніцтва Заходняй Беларусі, аўтар падкрэсліў нязначнасць колькасці прамысловага пралетарыяту (каля 5 %) у параўнанні з земляробствам, на якое прыпадае 85 % занятых працай. Характэрнай адзнакай прамысловасці Заходняй Беларусі, паводле М. Будзінскага, быў нізкі ўзровень яе канцэнтрацыі, вялікая раздробленасць і «значныя перадкапіталістычныя рэшткі», верагодна, з-за вялікай колькасці занятых у рамеснай і дробна-рамеснай вытворчасці, найперш яўрэяў. Даследчык падкрэслівае высокі працэнт «буржуазных элементаў» данымі аб класавым складзе па выніках перапісу 1921 г., выдзяляючы адпаведныя «класавыя групы», суміруючы ў адну катэгорыю «капіталісты і самастойныя дробныя вытворцы» істотна розных паводле характару прадпрыемстваў і спецыфікі ўдзелу ў іх функцыянаванні суб'ектаў прамыслова-рамеснай выторчасці. Такі падыход даваў гіпербалізаванае ўяўленне аб узроўні «буржуазных элементаў», у прыватнасці, названая катэгорыя ў прафесійнай структуры мела ў Беластоцкім ваяводстве 48,2 %, у Палескім 58,9 %, у Навагрудскім 66,3 %, у Віленскім 74,8 %. У той жа час колькасць «рабочых» адпаведна па ваяводствах была 42 %, 29,5 %, 23,0 % і 15,4 %, асобна выдзелена катэгорыя «членаў, памагаючых сем'ям (адпаведна, 6,4 %, 8,9 %, 8,8 % і 8,8 %), а таксама служачыя і «наглядны пэрсанал» (2,8 %, 2,5 %, 0,9 % і 0,9 %) [8, арк. 13]. Адзначым высокую ступень карэляцыі некаторых паказчыкаў крыніц, у прыватнасці адносна працэнта «самастойных прадпрымальнікаў» паводле матэрыялу да I з'езда КПЗБ і «капіталістаў і самастойных дробных вытворцаў» М. Будзінскага па Навагрудскім ваяводстве.

Неапублікаваныя матэрыялы выклікаюць вялікую цікавасць, яны адлюстроўваюць высокі ўзровень распрацоўкі сацыяльна-эканамічнай гісторыі Заходняй Беларусі, у тым ліку пытанняў прамыслова-рамеснай вытворчасці, праведзенай айчыннымі гісторыкамі з выкарыстаннем разнастайных дакументальных крыніц у выглядзе матэрыялаў польскай статыстыкі і даследаванняў, фінансавых і іншых дакументаў, у тым ліку якія праходзілі па розных савецкіх дзяржаўных і партыйных інстанцыях. Наяўныя матэрыялы не пацвярджалі афіцыйныя заідэалагізаваныя тэзісы аб заняпадзе і далейшым руйнаванні прамысловасці краю.

Праглядваецца выкарыстанне такога кшталту крыніцазнаўчых напрацовак у прадметных публікацыях па стане прамысловасці В. Фрышмана і Я. Шнейдэра пачатку 1930-х гг. [9, 10]. Названыя даследаванні вызначаліся больш высокім навуковым узроўнем у параўнанні з публікацыямі 1920-х гг., мелі пад сабой трывалую крыніцавую базу ў выглядзе звестак Галоўнага статыстычнага ўпраўлення, Прамыслова-гандлёвай палаты, Статыстыкі прамысловасці, Статыстыкі працы, Статыстычных штогоднікаў, Прамысловых і гандлёвых даведнікаў, справаздач інспекцыі працы, ваяводскіх дзённікаў і інш., што забяспечыла ім высокую ступень аб'ектыўнасці. Аднак і названыя аўтары асвятлялі прамысловую вытворчасць у духу ідэйна-палітычных прыярытэтаў, акцэнтуючы ўвагу на каланіяльным, аграрна-сыравінным стане эканомікі і заняпадзе прамысловасці на фоне поспехаў індустрыялізацыі ў БССР. Так, В. Фрышман вымушаны быў дапасоўваць свае тэарэтычныя погляды да палітыкі партыі і асабіста І. Сталіна, з аднаго боку, сцвярджаючы пра працягласць працэсу развіцця капіталізму ў Беларусі, з другога – падкрэсліваючы слабасць капіталістычных адносін. Аўтар сцвярджаў, што прамысловасць Заходняй Беларусі не развівалася, а «ў большасці галін згарнулася», абвяргаючы самога сябе справядлівай адзнакай таго, што «канцэнтрацыя вытворчасці заўважана амаль ва ўсіх галінах прамысловасці», па ініцыятыве ўрада адбываецца стварэнне манаполій, асабліва для арганізацыі сіндыката для замежнага гандлю. Згадваючы запалкавую, тытунёвую і спіртовую дзяржаўныя манаполіі, В. Фрышман адзначыў залежнасць ад знешніх рынкаў як характэрную рысу прамысловасці Заходняй Беларусі, калі некаторыя галіны працавалі выключна на экспарт (усе галіны лясной вытворчасці: дрэваапрацоўка, фанерная, лесанарыхтоўка), выявіў аб'ектыўныя перашкоды ў развіцці знешняга гандлю – значнае аддаленне ад портаў і «мёртвая» польска-літоўская мяжа [9, с. X, XVI–XX, 10, 11]. Як бачым, дастаткова шырока і шматаспектна прадстаўленая карціна гаспадарча-эканамічных адносін у Заходняй Беларусі была для таго часу дастаткова аб'ектыўнай, нягледзячы на зыходную зададзенасць і тэндэнцыйнасць.

Падобную кампаратывістыку бачым і ў Я. Шнейдэра, які падкрэсліваў заняпад заходнебеларускай і няўхільнае развіццё беларускай савецкай індустрыялізацыі, даказваючы перавагу сацыялістычных форм гаспадаркі перад капіталістычнымі [10, с. 9]. Разам з гэтым даследчык у Заходняй Беларусі вылучыў прамысловыя акругі (Беластоцкую, Віленскую і Белавежскую) і цэнтры (Гродна, Пінск, Ліда). Аўтар абверг тэзіс аб заняпадзе прамысловасці краю, у прыватнасці, на прыкладзе фанернай прамысловасці, фабрыкі якой «працавалі нават і ў крызісны 1932 г. на дзве і тры змены… звыш ¾ усёй фанернай прадукцыі ідзе на экспарт», і картоннай прамысловасці, якая «з 1925 г. хутка развіваецца. Дзякуючы наяўнасці добрых рынкаў збыту, фабрыкі абсталююцца машынамі, навейшай тэхнікай, што дае ім магчымасць пашыраць вытворчасць» [10, с. 17–23].

Аб'ектыўнасцю, абумоўленай выкарыстаннем польскай статыстыкі і публікацый, характарызуецца падыход Я. Шнейдэра да прэзентацыі рамяства Заходняй Беларусі. Да рамеснікаў аўтар аднёс розныя сацыяльныя групы, у тым ліку рамеснікаў – уладальнікаў майстэрань з некалькімі занятымі на іх рабочымі, палічыў іх па-сутнасці дробнымі капіталістамі, эксплуататарамі, але і тых, хто не меў сродкаў набыцця рамеснага пасведчання і жыў у самых горшых умовах і пастаяннай нястачы. Паводле аўтара, усяго не выкупілі патэнтаў у Заходняй Беларусі 16 120 нелегальных рамеснікаў, колькасць якіх увесь час павялічвалася, сярод іх большасць складалі шаўцы, сапожнікі і тэкстыльшчыкі. Даследчык прывёў звесткі перапісу 1931 г. аб размяшчэнні рамяства па паветах, па прафесіях, а таксама аб нязначнай колькасці рамеснікаў, якія выкарыстоўвалі наёмную рабочую сілу, адзначаючы пры гэтым раўнамерную іх лакалізацыю, за выключэннем буйных гарадоў [10, с. 24, 25].

Колькасныя паказчыкі прамыслова-рамеснай сферы залежылі ад методыкі статыстычнага падліку і групавання па катэгорыях, якая ўплывала на адпаведныя паказчыкі аўтараў і прыводзіла да істотнай розніцы колькасных паказчыкаў структурных элементаў прамыслова-рамеснай сферы. У прыватнасці, М. Будзінскі па 10 галінах падаў 17 697 рабочых [8, арк. 13], а Я. Шнейдэр па 12 галінах выявіў колькасць рабочых у 138 744 [10, с. 97, 98].

Адмоўныя фармулёўкі і апісальнасць пры падачы вытворча-прамысловай праблематыкі ў айчынных публікацыях 1920–1930-х гг. можна патлумачыць тым, што ў СССР прыватнае прадпрымальніцтва, прамыслова-рамесная сфера і звязаны з імі гандаль былі забаронены, прадстаўнікі гэтага класа траплялі ў лік «лішэнцев» і падаваліся як сацыяльна-варожыя элементы. Адначасова з гэтым у СССР разгортвалася хваля антысемітызму [4, с. 99]. Але пераносіць адпаведныя акцэнты і фармулёўкі на старонкі публікацый аб Заходняй Беларусі было непажадана з-за вялікага адсотку яўрэяў у этнічнай структуры рабочага класа Заходняй Беларусі.

Айчынныя савецкія даследчыкі вымушаны былі балансаваць паміж двума ўзаемна выключнымі паказчыкамі, якія ім неабходна было падкрэсліваць: паказваць адмоўныя паводле савецкай афіцыйнай ідэалогіі рэаліі капіталістычнага жыцця, павелічэнне замежных інвестыцый, рост акцыянернага капіталу, інтэнсіфікацыю вытворчасці і звальненні, якія паказвалі развіццё вытворчасці, абвяргалі думку аб няўхільным заняпадзе прамысловасці Заходняй Беларусі.

Палітычныя рэпрэсіі і разгром савецкай заходнебеларускай гістарыяграфіі прывялі да рэзкага звужэння фактаграфічнага напаўнення гісторыі прамыслова-рамеснай сферы Заходняй Беларусі, разлічанай на шырокае кола спажыўцоў сталінскай ідэалогіі і прапаганды. Прыкладам з'яўляецца праца І. Лочмеля, у адным абзацы якой маем звесткі аб няўхільным заняпадзе прамысловасці ў Заходняй Беларусі [11, с. 118]. Аднак у статыстычным даведніку для службовага карыстання маем якасна іншую карціну з вялікай колькасцю «буйных прамысловых прадпрыемстваў» і «электрастанцый па абласцях і ўездах» [12, с. 10–103].

Незапатрабаванасць аб'ектыўнай сацыяльна-эканамічнай гісторыі Заходняй Беларусі праяўлялася ў тагачасным гістарыяграфічным дыскурсе на фоне істотных крыніцавых напрацовак 1920–1930-х гг. і атрымання пасля верасня 1939 г. вялікай колькасці польскіх дакументаў. Аднак стаўленне да гаспадарча-эканамічнай праблематыкі не змянілася карэнным чы-

нам ні ў 1939–1941 гг., ні ў сярэдзіне 1940-х – першай палове 1950-х гг. Ілюстрацыяй гэтага з’яўляецца даследаванне Ц. Гарбунова, якое ў параўнанні з працай І. Лочмеля больш прадметна закранала тэму прамысловасці з апорай на матэрыялы статыстыкі. Аднак аўтар у выніку прыверjob;жанасці да традыцыі выяўлення адмоўных рыс польскай эканомікі ў цэлым, з характэрным для папярэдняга перыяду белетрызмам, галоўнай сваёй мэтай ставіў адлюстраванне росквіту прамысловасці БССР на фоне, па яго перакананні, крызіснадэпрэсіўнага стану заходнебеларускай прамысловасці. Гэта дасягалася і ў выніку разнастайных маніпуляцый са статыстычнымі данымі, напрыклад пры падачы інфармацыі аб сярэднегадавой колькасці рабочых буйной прамысловасці па 1913 г. і 1937 г., калі ў БССР выяўляўся істотны скачок і было, адпаведна, 26,2 тыс. і 215,1 тыс. рабочых, а ў Заходняй Беларусі, наадварот, упадак, з 12,3 тыс. колькасць рабочых знізілася да 12,1 тыс. [13, с. 78, 79, 82].

*Заключэнне.* Аналіз айчынных публікацый перыяду 1920-х – першай паловы 1950-х гг., якія сфарміравалі першапачатковую традыцыю айчыннай гістарыяграфіі прамысловай вытворчасці Заходняй Беларусі, сведчыць пра ідэалагічную зададзенасць і тэндэнцыйнасць з акцэнтацыяй увагі на адмоўных рысах, сцвярджэнні заняпаду, дэградацыі і знішчэння асобных галін у выніку дэструктыўнай эканамічнай палітыкі Польшчы. Гэта прыводзіла да парушэння патрабаванняў прынцыпу гістарызму, бо прамысловыя прадпрыемствы і цэлыя галіны на працягу розных адрэзкаў часу выяўлялі як відавочныя спады, так і перыяды заўважных уздымаў. Па некаторых жа паказчыках пры гэтым выяўлялася даволі аб’ектыўная карціна стану прамысловасці і рамяства, якія знаходзілася ў цяжкім становішчы ва ўмовах адсутнасці інвестыцый, дзяржаўных праектаў аздараўлення прамысловай сферы, разбуранай у час Першай сусветнай вайны, дэманстравалі скарачэнне колькасці прадпрыемстваў і занятых на іх работнікаў, істотнае зніжэнне колькасці выпускаемай прадукцыі, у тым ліку ў выніку падзення пакупніцкай здольнасці і немагчымасці канкурэнцыі з замежнымі і польскімі прадпрыемствамі.


*Літаратура і крыніцы*

1. *Наркевич, С. И.* Промышленность Западной Белоруссии в период белопольской оккупации (1920–1939 гг.) : дис. … канд. экон. наук / С. И. Наркевич. – Минск, 1965. – 209 л.
2. *Вайцешчык, Г.* Праблемы развіцця мястэчак Заходняй Беларусі 1920–1930-х гг. у айчыннай гістарыяграфіі / Г. Вайцешчык // Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі гарадоў і працэсаў урбанізацыі ў Беларусі : зб. навук. арт. – Гродна, 2009. – С. 412–417.
3. *Лаўрэнка, Л. В.* Даследаванне прамысловай, рамеснай вытворчасці і гандлю Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. у айчыннай гістарыяграфіі / Л. В. Лаўрэнка // Весн. Брэсц. ун-та. – 2016. – № 2. – С. 34–42.
4. *Савіч, А. А.* Айчынная гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў : манаграфія / А. А. Савіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2019. – 300 с.
5. М. С. Сучасная Польшча і Заходняя Беларусь / М. С. // Заходняя Беларусь. Зборнік. – Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1925. – С. 3–30.
6. *Беразоўскі, А.* Заходняя Беларусь пад пятой польскіх акупантаў (За што Пілсудзкі разграміў Грамаду) / А. Беразоўскі. – Менск : Выд-ва ЦК МОПР БССР, 1928. – 45 с.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 164.
8. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 646.
9. *Фришман, В.* Промышленность Западной Белоруссии: Стат.-экономическое описание / В. Фришман. – Минск : Изд-во Беларус. акад. наук, 1934. – 133 с.
10. *Шнейдер, Я.* Очерк размещения промышленности Западной Белоруссии / Я. Шнейдер. – Минск : Изд-во Акад. наук, 1936. – 104 с.
11. *Лочмель, И. Ф.* Очерк истории борьбы белорусского народа против польских панов / И. Ф. Лочмель. – М. : Воениздат, 1940. – 163 с.
12. Западная Белоруссия : стат. справ. / Гос. пл. комис. при СНК БССР, Упр. народнохозяйств. учета БССР. – Минск : Изд. Госплана при СНК БССР и УНХУ БССР, 1939. – 142 с.
13. *Горбунов, Т.* Воссоединение белорусского народа в едином советском социалистическом государстве / Т. Горбунов. – М. : Гос. изд-во полит. лит., 1948. – 232 с.

*References*

1. *Narkevich, S. I.* Promyshlennost' Zapadnoj Belorussii v period belopol'skoj okkupacii (1920–1939 gg.) : dis. … kand. ekon. nauk / S. I. Narkevich. – Minsk, 1965. – 209 l.
2. *Vajceshchyk, G.* Prablemy razviccya myastechak Zahodnyaj Belarusi 1920–1930-h gg. u ajchynnaj gistaryyagrafii / G. Vajceshchyk // Gistaryyagrafiya i krynicy pa gistoryi garadoŭ i pracesaŭ urbanizacyi ŭ Belarusi : zb. navuk. art. – Grodna, 2009. – S. 412–417.
3. *Laŭreenka, L. V.* Dasledavanne pramyslovaj, ramesnaj vytvorchasci i gandlyu Zahodnyaj Belarusi 1921–1939 gg. u ajchynnaj gistaryyagrafii / L. V. Laŭreenka // Vesn. Bresc. un-ta. – 2016. – № 2. – S. 34–42.
4. *Savich, A. A.* Ajchynnaya gistaryyagrafiya gistoryi Zahodnyaj Belarusi 1921–1939 gadoŭ : managrafiya / A. A. Savich ; navuk. red. A. A. Kavalenya. – Brest : BrDU imya A. S. Pushkina, 2019. – 300 s.
5. M. S. Suchasnaya Pol'shcha i Zahodnyaya Belarus' / M. S. // Zahodnyaya Belarus'. Zbornik. – Mensk : Dzyarzh. vyd-va Belarusi, 1925. – S. 3–30.
6. *Berazoŭski, A.* Zahodnyaya Belarus' pad pyatoj pol'skih akupantaŭ (Za shto Pilsudzki razgramiŭ Gramadu) / A. Berazoŭski. – Mensk : Vyd-va CK MOPR BSSR, 1928. – 45 s.
7. Nacyyanal'ny arhiŭ Respubliki Belarus' (NARB). – F. 242p. Vop. 2. Spr. 164.
8. NARB. – F. 60p. Vop. 3. Spr. 646.
9. *Frishman, V.* Promyshlennost' Zapadnoj Belorussii: Stat.-ekonomicheskoe opisanie / V. Frishman. – Minsk : Izd-vo Belarus. akad. nauk, 1934. – 133 s.
10. *Shnejder, Ya.* Ocherk razmeshcheniya promyshlennosti Zapadnoj Belorussii / Ya. Shnejder. – Minsk : Izd-vo Akad. nauk, 1936. – 104 s.
11. *Lochmel', I. F.* Ocherk istorii bor'by belorusskogo naroda protiv pol'skih panov / I. F. Lochmel'. – M. : Voenizdat, 1940. – 163 s.
12. Zapadnaya Belorussiya : stat. sprav. / Gos. pl. komis. pri SNK BSSR, Upr. narodnohozyajstv. ucheta BSSR. – Minsk : Izd. Gosplana pri SNK BSSR i UNHU BSSR, 1939. – 142 s.
13. *Gorbunov, T.* Vossoedinenie belorusskogo naroda v edinom sovetskom socialisticheskom gosudarstve / T. Gorbunov. – M. : Gos. izd-vo polit. lit., 1948. – 232 s.